# Незалежныя выдавецтвы і гістарычная навука ў Беларусі пасля пратэстаў 2020 г.

**Дыскусія 8 снежня 2022 г.**
**19:00-20:30 (беларускі час)**

Дыскусія адбудзецца на беларускай і нямецкай мовах з сінхронным перакладам.

ФОРУМ ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ
FORUM FÜR HISTORISCHE BELARUS-FORSCHUNG

DGO
Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

**Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы:**
**https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_j7T38mfmQJeIevef_1odQw**

Вясной гэтага году выдавец Андрэй Янушкевіч быў арыштаваны падчас адкрыцця сваёй кнігарні ў Мінску і правёў у зняволенні 28 сутак. А ў кастрычніку судом Мінска некаторыя кнігі выдавецтва былі ўнесены ў спіс «экстрэмісцкай» літаратуры. Дзеянні рэжыму ў дачыненні да Янушкевіча – адзін з прыкладаў таго, што адбываецца з незалежнымі выдавецтвамі, якія хочуць “наблізіць гісторыю і літаратуру да людзей”.

Менавіта таму дыскусія Форума гістарычных даследаванняў Беларусі робіць прадметам сваёй увагі становішча незалежных выдавецтваў у Беларусі пасля пратэстаў 2020 г. На працягу многіх гадоў гэтыя выдавецтвы выступалі альтэрнатыўнай пляцоўкай для публікацыі навуковых даследаванняў і крытычных дыскусій у галіне гістарычнай навукі. Часопіс і выдавецтва ARCHE друкавалі манаграфіі і тэксты замежных і беларускіх гісторыкаў, якія ставілі пад пытанне афіцыйны нараты́ў па гісторыі Беларусі. Такія тэмы, як Беларусь пад нямецкай акупацыяй, саветызацыя Беларусі, Другая сусветная вайна і найноўшая гісторыя Беларусі выклікалі асаблівую цікавасць як чытачоў, так і дзяржаўных цэнзараў. Нягледзячы на шматлікія судовыя працэсы, забарону на падпіску і канфіскацыю выданняў, выдавецтва працягвала сваю дзейнасць з 1998 г.

Падчас нашай дыскусіі мы абмяркуем наступныя пытанні: якую ролю адыгрывалі незалежныя выдавецтвы для гістарычнай навукі і што адбываецца з імі зараз, калі іх дзейнасць фактычна крыміналізавана? Як паўплывалі рэпрэсіі ў дачыненні да гісторыкаў і выдаўцоў на гістарычную навуку Беларусі і што азначае case з манаграфіяй Святланы Казловай, якая была апублікавана Янушкевічам і цяпер уваходзіць у спіс “экстрэмісцкай” літаратуры? І ці мусіць вайна ва Украіне і яе наступствы падштурхнуць да пераасэнсавання гістарычнай навукі ў Беларусі і якая роля ў гэтым можа быць у незалежных выдавецтваў?

**Уступнае слова:**

**Томас Бон**
Універсітэт ім. Юстуса Лібіха, Гісэн

**Эксперты:**

**Валер Булгакаў**
Часопіс ARCHE

**Святлана Казлова**
Свабодны гісторык

**Аляксандр Фрыдман**
Універсітэт імя Гумбальдта, Берлін

**Андрэй Янушкевіч**
Выдавецтва “Янушкевіч”

**Мадэрацыя:**

**Фолькер Вайксэль**
Часопіс “Усходняя Еўропа”